# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА І. С. ВЯЛАВА





**Кіраўнік групы І. С. Вялаў, дачка Васіліса і сын Алёша**

**Перыяд дзеяння:**

верасень 1942 г. – кастрычнік 1943 г.

**Месца дзеяння:**

раён Сакольніцкіх вуліц г. Віцебска

**Колькасць:**

4 чалавекі

**Кіраўнікі:**

Вялаў Іларыён Сямёнавіч («Кузняцоў»)

Дзейнічала з верасня 1942 г. да кастрычніка 1943 г. У групу ўваходзілі І. С. Вялаў («Кузняцоў») і яго дзеці: 16-гадовая камсамолка Васіліса, 14-гадовая Ганна і 12-гадовы Алёша («Малыш»). Асноўная канспіратыўная кватэра знаходзілася ў хаце Вялавых па вуліцы 2-й Сакольніцкай, 2.

З 1943 г. група дзейнічала пад кіраўніцтвам падпольнага гаркама КП(б)Б. Каб збіраць інфармацыю і карміць сям'ю, Вялаў пачаў працаваць цесляром на чыгуначным вакзале. Сачыў за перамяшчэннем вайсковых эшалонаў і грузаў, двойчы падпальваў памяшканне вакзала, каб зноў рабіць там рамонт. Васіліса («Дзіна») і Ганна («Малая») дапамагалі стрыечнай сястры, падпольшчыцы Е. С. Спірыдонавай, раскідваць у горадзе лістоўкі. Каб узарваць будынак гарадской паліцыі і пашпартнага стала, Васіліса і Ганна даставілі тол у мяху з бульбай і 19 студзеня 1943 г. выканалі заданне. У выніку быў разбураны будынак, забіта два і паранена пяць паліцаяў. Алёша перадаваў падпольнаму гаркаму партыі і партызанам разведданыя, кіслату, а ў горад – лістоўкі, газеты, даручэнні для бацькі.

У сакавіку 1944 г. сям'ю Вялавых гітлераўцы змясцілі ў лагер смерці ў Чашніцкім раёне, дзе яны і знаходзіліся да вызвалення. У 1946 г. ад сухотаў памерлі Васіліса і Алёша, у 1964 г. пайшоў з жыцця І. С. Вялаў.

У гонар падпольшчыкаў Вялавых у Віцебску па вуліцы 2-й Сакольніцкай, на месцы, дзе стаяла хата змагароў, устаноўлена мемарыяльная дошка. Усе члены групы ўзнагароджаны медалямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група І. С. Вялава / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 483.

2. **Подпольная** группа Вялова И. С. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 286.